

.BY
КОМІКСЫ ПА-БЕЛАРУСКУ

ПАДАННІ #27

ПЕРАКЛАД:
АРТУР БАРАДАЧОЎ
АФАРМЛЕННЕ:
СЯРГЕЙ КОЗЫРАЎ
COMICSBY.BY
VK.COM/COMICS_BY


ПАДАННІ СТВОРАНЫ **Б. УІЛІНГХЭМАМ**


FABLES

4

ПЕРАКЛАД
НА БЕЛАРУСКУЮ МОВУ:
АРТУР БАРАДАЧОЎ

АФАРМЛЕННЕ:
СЯРГЕЙ
КОЗЫРАЎ







Леў у авечай шкуры

Глава восьмая. Марш драўляных салдатаў

Bill Willingham writer/creator
Mark Buckingham penciller
Steve Leialoha inker
Daniel Vozzo color/seps
Todd Klein lettering
James Jean cover art
Mariah Huehner assistant editor
Shelly Bond editor







ТУШЭ.
ЧАМУ МЫ ТУТ? У МЯНЕ БІТВА Ў САМЫМ РАЗГАРЫ.
НЕ, ТВАЯ БІТВА ПАЧЫНАЕЦЦА ТУТ СА **МНОЙ**.
ГЛУПСТВА, Я...
ШТО **ГЭТА** БЫЛО?
ІХ ЦУДОЎНЫ **ВОЎК** ПРЫЙШОЎ, КАБ ВЫРАТАВАЦЬ ГЭТЫ ДЗЕНЬ.
ТВАЯ БІТВА ЎНІЗЕ **СКОНЧЫЛАСЯ**, ДЗЯКУЮЧЫ ГЭТАМУ ВЫРАДКУ ПАЎНОЧНАГА ВЕТРУ – ЯК І БІТВА ТУТ, НАВЕРСЕ, СКОНЧЫЦЦА ДЗЯКУЮЧЫ **МНЕ**.
І ДАВАЙ ДАБАВІМ ТРОШКІ ДАЖДЖУ, КАБ ПРЫНЯЦЬ НЯСЦЕРПНЫЯ АГЕНЬЧЫКІ.
ТЫ **ХВАЛІШСЯ**, ФРАУ ТОТЭНКІНДАР, У АПОШНІЯ ХВІЛІНЫ СВАЙГО ЖЫЦЦЯ.
ТЫ САПРАЎДЫ ЖАДАЕШ ВЫКЛІКАЦЬ МЯНЕ НА **ДУЭЛЬ**? ТЫ **НІКОЛІ** НЕ БЫЛА Ў МАЁЙ ЛІЗЕ.
МАГЧЫМА НЕ, У **МІНУЛЫЯ** ДНІ НА СТАРЫХ ЗЕМЛЯХ, АЛЕ ТЫ ТУТ ЧУЖАЯ, НА ГЭТЫМ МАЛЕНЬКІМ ЛАПІКУ, ДЗЕ Я МАГУ САТКАЦЬ І ЗВЯЗАЦЬ **СОТНІ** РОЗНЫХ ЗАКЛІНАННЯЎ.
ТЫ ЗАТРЫМАЛАСЯ Ў МЯНЕ, У ЦЭНТРЫ МЕСЦА **МАЁЙ** СІЛЫ, ДУРНАЯ ЖАНЧЫНА.
ДОБРА, ДАВАЙ ПАЧНЕМ.
ГЭТА БЯСКОНЦАЯ ГУТАРКА **СТАМІЛА** МЯНЕ.



БОЗЛІ!
ЁН **ЗРАБІЎ** ГЭТА!
БОЗЛІ! **БЛАГАСЛАВІ** БОЖА, ТЫ ПРЫЙШОЎ У ПАРУ!
ТРЭБА СКАЗАЦЬ, ШТО Я **НІКОЛІ** НЯ ДУМАЎ, ШТО БУДУ ТАК РАД ЦЯБЕ БАЧЫЦЬ, СТАРЫ САБАКА.
АДСВЯТКУЕМ ПАЗНЕЙ.
У НАС ЯШЧЭ ШМАТ **ПРАЦЫ**.
ПАДЗЯЛІЦЕСЯ НА ТРЫ КАМАНДЫ.
YELLOWBRICK ROADHOUSE


ТЫ ПРЫЙШОЎ!
СПАДАРЫНЯ СНЕЖКА?
ПЕРШАЯ ГРУПА ГАСІЦЬ ПОЛЫМЯ Ў БУДЫНКАХ, ДА ЯКІХ ЯШЧЭ НЕ ДАБРАЛАСЯ ЗАЛЕВА.
ГЭТА БЯРУ НА СЯБЕ. ПАЖАРНІКІ, УВАГУ НА МЯНЕ!
ДРУГАЯ ГРУПА ЗБІРАЕ ПАРАНЕНЫХ І АДНОСІЦЬ ІХ УНУТР.
СПАДАРЫНЯ СНЕЖКА.
ВЫ ЗАБЫЛІСЯ СВАЮ **ПАЛКУ**.
А ТРЭЦЯЯ ГРУПА АГЛЯДВАЕ ДРАЎЛЯНЫХ САЛДАТАЎ. РУПЛІВА ПРАВЯРАЙЦЕ КОЖНАГА.
ЯКІМІ Б **МЁРТВЫМІ** ЯНЫ НІ ВЫГЛЯДАЛІ, ПЕРАКАНАЙЦЕСЯ, ШТО ЯНЫ БЕЗ **ГАЛОЎ**.
ЗРОБІМ – ЗБЯРЭМ ГАЛОВЫ.
СКЛАДАЙЦЕ ЎНУТРЫ АДНАГО З ПАКОЯЎ БІЗНЕС-ОФІСА... ЯК МАГА ДАЛЕЙ АД ЦЕЛ.
БОЗЛІ!



Я ВЕДАЛА!
БЕЛА?
Я **ВЕДАЛА**, ШТО ТЫ ВЫРАТУЕШ НАС!
ТЫ ЗАЎСЁДЫ НАС ВЫРАТОЎВАЕШ!
СПАДАРЫНЯ СНЕЖКА!
НУ І НУ!




ТЫ ЗАЎСЁДЫ ВЫРАТОЎВАЕШ МЯНЕ.
БЕЛА, Я ТАКСАМА ДА ДРЫЖЫКАЎ РАДЫ ЦЯБЕ БАЧЫЦЬ. АЛЕ ТУТ ЛЬЕ ЯК З ВЯДРА, А ТЫ ЦЯЖАРНАЯ.
ПАДУМАЙ ПРА ДЗЯЦЕЙ. ЗАРАЗ ЖА ІДЗІ Ў ПАМЯШКАННЕ.
ОГО! ВЫ ГЭТА БАЧЫЛІ?
МУХ, АДВЯДЗІ БЕЛУ ЎНУТР.
МАЯ СЯСТРА, НА ЗДЗІЎЛЕННЕ, ТАКАЯ... ЖЫВЕЛА.
ЦЯПЕР ВЕРНЕМСЯ ДА СПРАВЫ, ХЛОПЦЫ. КАЛІ БОЙ І СКОНЧЫЎСЯ, ВАЙНА НЕ.
ХТО Б МОГ ПАДУМАЦЬ.




ЧАЦВЕР, 28 САКАВІКА. АДРАЗУ ПАСЛЯ ДЗВЮХ ГАДЗІН НОЧЫ.
ЦЯГНЕЦЦА ДОЎГАЯ НОЧ.
ТЫ БАЧЫЎ ГЭТА, МУХАЛОЎ?
МАЛАНКА, АЛЕ ВЕЛЬМІ БЛІЗКА. МАБЫЦЬ, НАВАТ НАД НАШЫМ ДАХАМ.
ВЫ ЛІЧЫЦЕ, НАМ ТРЭБА ПАЙСЦІ ПРАВЕРЫЦЬ?
СТОЙ ТУТ. ТРЫМАЙ ЛІФТ.
Я ЎСЁ РАЗВЕДАЮ.
СЭР, АСЦЯРОЖНЕЙ.
ШТО ГЭТА?
ТАМ ХТОСЬЦІ ЁСЦЬ?


О НЕ.
НАПРАМІЛЫ БОЖА.
МУХ!
УНІЗ!
ЖМІ ЎНІЗ!
НАМ ТРЭБА ЎНІЗ, ЗАРАЗ ЖА!
ШТО ТАКОЕ, СЭР? ШТО ВЫ БАЧЫЛІ?
НЕШТА? У СЭНСЕ НІЧОГА!
І ДА КАНЦА НОЧЫ НІХТО НЕ ПАВІНЕН ПАДЫМАЦЦА ТУДЫ! ГЭТА ЗАГАД!


ЯК?
ПРАБАЧ?
Я НЕ ЗУСІМ РАЗУМЕЮ, ШТО ТЫ КАЖАШ.
ЯК ТЫ ГЭТА ЗРАБІЛА?
Я РАСТЛУМАЧЫЛА ТАБЕ РАНЕЙ: У ГЭТЫМ МЕСЦЫ Я МАГУТНЕЙ ЗА ЦЯБЕ.
У МІНУЛЫМ Я МАГЛА БЫЦЬ ТАКОЙ У ЛЮБЫМ МЕСЦЫ. НЯДРЭННА, НАРЭШЦЕ, РАЗАБРАЦЦА Ў НАШЫХ АДНОСІНАХ, ТЫ ЯК ЛІЧЫШ?


АЛЕ Я... Я ЗАЎСЁДЫ БЫЛА...
ВЕДАЮ. ТЫ БЫЛА Ў **МНОСТВЕ** КАЗАК... ТАКАЯ ЖУДАСНАЯ І ТАКАЯ ВЯДОМАЯ.
Я НІКОЛІ НЕ ЗАДУМВАЛАСЯ НАКОНТ ТОЙ ЛУХТЫ, ШТО "ПАПУЛЯРНАСЦЬ ДАЕ МОЦ".
У КАНТРАЛЯВАНЫХ УМОВАХ ГЭТА ЯШЧЭ НІКОЛІ НЕ ПРАВЯРАЛАСЯ.
Я СПРАБАВАЛА НЯ ЎЛАЗІЦЬ ВА ЎСЕ ГЭТЫЯ ГІСТОРЫІ. Я АДДАЮ ПЕРАВАГУ АНАНІМНАСЦІ І ВОЛІ ДЗЕЯННЯЎ.
«А ТУЮ АДЗІНУЮ КАЗКУ ЯНЫ І **НЕ ЎСПОМНЯЦЬ**, У РЭШЦЕ РЭШТ ЯНЫ НІКОЛІ НЯ ВЕДАЛІ МАЙГО ІМЯ».
«МАГЧЫМА, У ЛЕСЕ БЫЛА ІНШАЯ СТАРАЯ ВЯДЗЬМАРКА».
Я **ЗАЎСЁДЫ** БЫЛА МАЦНЕЙ, ЧЫМ ТЫ ЛІЧЫЛА. МЯНЕ ЗАБІВАЛІ **ТУЗІНУ** РАЗОЎ, АЛЕ НІ РАЗУ ДА КАНЦА.
НАВАТ АБЯРНУЎШЫСЯ Ў ПОПЕЛ У СВАЁЙ **ХАЦЕ**, ПРАЗ СТОЛЬКІ ГАДОЎ, Я ВЯРНУЛАСЯ.
НЯДРЭННА ДЛЯ КВОЛАЙ СТАРОЙ ЦЫПАЧКІ, А?
ЦЯПЕР ПАМАЎЧЫ І ДАЗВОЛЬ МНЕ ДАВЯЗАЦЬ. ТРЭБА ПЕРАСТАЦЬ ЗМАГАЦЦА І ДАЦЬ ЦЕМРЫ ЗАБРАЦЬ ЦЯБЕ.
ТВАЯ ГІСТОРЫЯ ПАДЫХОДЗІЦЬ **ДА КАНЦА**, БАБА ЯГА.


ПЯТНІЦА, 29-Е САКАВІКА.
І ЗНОЎ НАВІНЫ **РЭГІЁНА**: У ВЕРХНІМ ВЭСТ-САЙДЗЕ ВЕЧАРЫНА Ў КВАРТАЛЕ, ЯКАЯ ВЫЙШЛА З-ПАД **КАНТРОЛЮ**, ПРЫВЯЛА ДА **НЕВЯЛІКАГА** ПАЖАРА, ЯКІ БЫЎ ХУТКА НЕЙТРАЛІЗАВАНЫ. ПАЦЯРПЕЎШЫХ НЯМА.
I ДА **ІНШЫХ** НАВІН: УЧОРА СЯМЕЙНАЕ БАРБЕКЮ ВЫЙШЛА З-ПАД КАНТРОЛЮ, ШТО ПРЫВЯЛО ДА НЕВЯЛІКАГА ПАЖАРА, ЯКІ БЫЎ ХУТКА ПАГАШАНЫ.
LIVE AT FIVE!
CHANNEL 5
ПАЦЯРПЕЎШЫХ НЯМА.
І ДА ІНШЫХ НАВІН.
ТЫ СЛУХАЕШ ЯГО, МАЙК? ТЫ ЧУЕШ, ШТО КАЖА ТВОЙ ДЫКТАР?
БОЙКА ПАМІЖ ДЗВЮМА ВУЛІЧНЫМІ БАНДАМІ Ў ВЕРХНІМ ВЭСТ-САЙДЗЕ ПРЫВЯЛА ДА НЕВЯЛІКАГА ПАЖАРА, ЯКІ ХУТКА БЫЎ ПАГАШАНЫ.
CHANNEL 5
LIVE AT FIVE!
ШТО ТАБЕ **ТРЭБА**, КЕВІН? МЫ Ў СЯРЭДЗІНЕ ПРАМОГА **ЎКЛЮЧЭННЯ**. Я **ЗАНЯТЫ**.
ТВОЙ ЭФІРНЫ **КРЭЦІН** ТОЛЬКІ ШТО СКАЗАЎ ТРЫ РАЗЫ АДНУ І ТУЮ Ж **НАВІНУ**. ПА-РОЗНАМУ, З РОЗНЫМІ **ПАДРАБЯЗНАСЦЯМІ**.
ПАЦЯРПЕЎШЫХ НЯМА.
LIVE AT FIVE!
CHANNEL 5
ТАБЕ ГЭТА НЕ ЗДАЕЦЦА **НЕКАЛЬКІ ДЗІЎНЫМ**? ХОЦЬ КАМУ-НЕБУДЗЬ?
ТОЕ, ШТО МЫ ПАВЕДАМІЛІ МАЛАВАЖНУЮ НАВІНУ РЭГІЁНА? СЁННЯ З ІМІ ЗАСТОЙ, КЕВІН.




ТРЫ НАВІНЫ, МАЙК! ТРЫ! АЛЕ Ж ТЫ НАВАТ НЕ РАЗУМЕЕШ, ТАК?
ІДУ Ў ЗАКЛАД, ШТО КАЛІ ТЫ ГЭТА ПЕРАГЛЕДЗІШ, ТЫ СКАЖАШ, ШТО ГЭТА РОЗНЫЯ ГІСТОРЫІ.
ШТО ТЫ ПРЫДУМАЎ У ГЭТЫ РАЗ, КЕВІН? ЗНОЎ БУДЗЕШ ГУЛЯЦЬ У «САКРЭТНЫЯ МАТЭРЫЯЛЫ»?
НУ, ТЫ ЎСЁ Ж НЕ АГЕНТ МАЛДАР, І КАЛІ ТАМ САПРАЎДЫ ЁСЦЬ ПРАЎДА, МЫ НЕ ТРАКТУЕМ ПРАЎДУ. МЫ ПАВЕДАМЛЯЕМ ФАКТЫ.
КАМПРЭНДЭ, СЯБРА?
Я ПРАЦЯГНУ САЧЫЦЬ ЗА ГЭТАЙ ГІСТОРЫЯЙ.
ЯКОЙ ГІСТОРЫЯЙ? ЯНА БЫЛА ЗАПАЎНЯЛЬНІКАМ...
СУСЕДЗІ Ў ТЫМ ЖА РАЁНЕ ПАВЕДАМІЛІ ПРА ДЗІЎНЫЯ РЭЧЫ ТОЙ НОЧЧУ. ЛЮДЗІ Ў ЧОРНЫМ І ЛЯТУЧАЯ...
ТАЛЕРКА?
КАЛІ ТЫ СКАЖАШ «ЛЯТУЧАЯ ТАЛЕРКА», ТО ТЫ ЗВОЛЬНЕНЫ ДА ЛІХАМАТАРЫ, КЕВІН ТОРН.
УВОГУЛЕ, ГЭТА БЫЎ ЛЯТУЧЫ ЛОЖАК З ЦУДОЎНАЙ ДЗЯЎЧЫНКАЙ НА ІМ.
ВОН!



СУБОТА, 30-Е САКАВІКА.
ШТО МЫ БУДЗЕМ РАБІЦЬ, СНЕЖКА?
РАМОНТ. ПРАЦЯГВАЦЬ.
ГЭТЫЯ БУДЫНКІ БЫЛІ ПАБУДАВАНЫ ДАЎНО, ЯШЧЭ КАЛІ РЭЧЫ РАБІЛІСЯ НА СТАГОДДЗІ. ЗАРАЗ ЯНЫ ВЫГЛЯДАЮЦЬ ДРЭННА, АЛЕ ЯНЫ МОЦНЫЯ.
МЫ ІХ АДРАМАНТУЕМ.
14
FOR
LAUNDROMAT
NOD'S BOOKS
ПАСЛЯ ТАГО, ЯК ПАХАВАЕМ ЗАГІНУЛЫХ?
УЖО ЧАС?
ТАК. БАДАЙ, НАМ ТРЭБА ІСЦІ.




МЫ АДДАЕМ ЦЕЛА НАШАГА **ШАНОЎНАГА** ЗАГІНУЛАГА БРАТА ПА ЗБРОІ, **МЯДЗВЕДЗЯ БУ**, У НЕПРАГЛЯДНУЮ **БЕЗДАНЬ** ВЯДЗЬМАРСКАЙ СТУДНІ.
МЫ СПАДЗЯЕМСЯ, ШТО ЁН ЗНОЙДЗЕ **НОВАЕ** ЖЫЦЦЁ ЦІ, ПРЫНАМСІ, ЗНОЙДЗЕ **СУПАКОЙ** У АБДЫМКАХ ГЛЫБІНІ І **НЯЎХІЛЬНЫХ** ЧАРАЎ.
БЫВАЙ, МАЛЫШ БУ! МОЙ МІЛЫ МАЛЫШ! МАЦІ КАХАЕ ЦЯБЕ!
ХТО НА-СТУПНЫ?
ГЭТА МЫШЫНАЯ ПАЛІЦЫЯ.
ЯНЫ ЎДЗЕЛЬНІЧАЛІ Ў БІТВЕ?
О ТАК. МАЛА ХТО **ЗАЎВАЖЫЎ** ІХ, АЛЕ ЯНЫ ЗРАБІЛІ СВАЮ СПРАВУ... ЯНЫ СЛАЎНА І ХРАБРА ПАКАЗАЛІ СЯБЕ...
...«НА ВЕЛЬМІ НЕБЯСПЕЧНЫМ ЗАДАННІ».



«ПАДЧАС РУКАПАШНАГА БОЮ НА ВУЛІЦЫ БУЛФІНЧ, ЯШЧЭ ПЕРАД ПАЖАРАМ, ЯНЫ РАЗГРУПАВАЛІСЯ СЯРОД ВОРАГАЎ».
«КОЖНАЯ КАМАНДА ЎСКАРАСКВАЛАСЯ ПАД КАЛАШЫНУ САЛДАТА...»
«...РАСКРУЧ-ВАЮЧЫ ДРЭН-НА СКРЭПЛЕ-НЫЯ ЗЛУЧЭННІ ІХ КАЛЕН...»
«...ПАРАЛІЗУЮЧЫ ПРАЦІЎНІКА, КАЛІ ТОЙ РУХАЎ НА НАС."
БОЛЬШ ПАЛОВЫ МЫШЫНАЙ ПАЛІЦЫІ БЫЛІ **РАСЦІСНУТЫ** НАСМЕРЦ... ЗАБІТЫ ЎЛАСНЫМ ПОСПЕХАМ, ТАМУ ШТО ІХ ЦЭЛІ ПАДАЛІ НА ІХ ЗВЕРХУ.
АДДАДЗІМ ІХ ЦЕЛЫ ВЯДЗЬМАРСКАЙ СТУДНІ.


ХТО ГЭТА?
ЦЕЛА ЧЫРВОНАГА КАПЯЛЮШЫКА.
ШТО?!
ВЫ ЗБІРАЕЦЕСЯ ПАХАВАЦЬ **ГНОЙНЫ** ТРУП ГЭТАЙ ВЯДЗЬМАРКІ ПОБАЧ З МАІМ **СЫНАМ**?
І СА СПАДАРОМ ВЕЛУНДАМ, З УСІМІ ІНШЫМІ ДОБРЫМІ КАЗАЧНЫМІ?
МЫ ПАВІННЫ. МНЕ ШКАДА, АЛЕ ЯНА ВЕЛЬМІ НЕБЯСПЕЧНАЯ.
ГЭТА АДЗІНЫ СПОСАБ ГАРАНТАВАЦЬ, ШТО ЯНА НІКОЛІ НЯ ЗМОЖА ЗНОЎ ПРЫНЕСЦІ НЯШЧАСЦЕ.
ЗРАБІЦЕ ГЭТА – АЛЕ НЕ КАЖЫЦЕ НІВОДНАГА ДОБРАГА СЛОВА.
НЕ ДЛЯ ТАКОЙ, ЯК ЯНА.
ГЭТА НАШ САМЫ ЦЯЖКІ **ВОРАГ – ЖУДАСНАЯ** ЖАНЧЫНА, ІМЯ ЯКОЙ МЫ НАВАТ НЕ НАЗАВЕМ.
КАЛІ ТАМ ЁСЦЬ **НЕШТА**, ШТО МОЖА ПРЫЧЫНІЦЬ ЁЙ ВЕЧНЫ **БОЛЬ** І ПАКУТЫ, БУДЗЬ НАШЫМ **ГОСЦЕМ**.


ЛЮБАЕ КРЭСАЛКА, ПАСТУШОК. ВЫГЛЯДАЕ ЗНАЁМА.
СПАДАРЫНЯ СНЕЖКА ДАЛА МНЕ СВАЁ СТАРОЕ КРЭСЛА. СПАДЗЯЮСЯ, ВЕРНУ ЯГО РАНЕЙ.
ТЫ АЧУНЯЕШ. Я НАВАТ ЧУЎ, ШТО ДОКТАР СВІНОЕ СЭРЦА КАЖА, ШТО МОЖА ВЫПРАВІЦЬ ТВАЕ ПАЛЬЦЫ.
ЁН, ЗДАЕЦЦА, У ГЭТЫМ ЦАЛКАМ УПЭЎНЕНЫ, У АДРОЗНЕННЕ АД МЯНЕ.
СПАДЗЯЮСЯ. МНЕ ЗАЎСЁДЫ ПАДАБАЛАСЯ ЧУЦЬ, ЯК ТЫ ІГРАЕШ.
САПРАЎДЫ, МІСТЭР ВОЎК? ВЫ РАНЕЙ ТАК НЕ КАЗАЛІ.


ХТО-НЕБУДЗЬ З ХЛОПЦАЎ УЖО РАЗМАЎЛЯЎ?
УВЕСЬ ЧАС. АЛЕ НІЧОГА ВАЖНАГА. УСЕ РАЗАМ ПРАКЛІНАЮЦЬ МЯНЕ ЦІ БАЛБОЧУЦЬ АДЗІН З АДНЫМ.
ЗАРАЗ ЯНЫ МАЎЧАЦЬ. МАБЫЦЬ СПЯЦЬ? У ЛЮБЫМ ВЫПАДКУ, ЗДАЕЦЦА, ЯНЫ ЎСЁ РОБЯЦЬ АДНАЧАСНА.
ТРЫМАЙСЯ, МАЛЫШ. З ЧАСАМ МЫ ШМАТ ЧАГО АД ІХ АТРЫМАЕМ.
У НАС ЁСЦЬ ТОЛЬКІ ЧАС.
ЯК ПАЖЫВАЕ НАШ ФАЛЬШЫВЫ КАПЯЛЮШЫК?
ЯНА ЖЫВАЯ... НА ЗДЗІЎЛЕННЕ... АЛЕ СЛАБАЯ.


Я ВЫПАМПОЎВАЮ ЯЕ МАГІЮ КОЖНЫ ДЗЕНЬ. ЯНА БУДЗЕ БЕЗДАПАМОЖНАЙ СТОЛЬКІ, КОЛЬКІ НАМ ПАТРАБУЕЦЦА.
МОГУЦЬ ЗАПАТРАБАВАЦЦА ГАДЫ.
Я ЎМЕЮ ЧАКАЦЬ.
ЯНА ЧУЕ МЯНЕ?
А ЯК ЖА.
СЛУХАЙ СЮДЫ, БАБА ЯГА. ЦЯПЕР ТЫ АДНА. НІХТО НАВАТ НЯ ВЕДАЕ, ШТО ТЫ ЖЫВАЯ, АКРАМЯ МЯНЕ І ФРАЎ ТОТЭНКІНДАР.
НІ ЕЖЫ, НІ КАМФОРТУ, НІ ЗАБАВЫ, І НІЯКАЙ КАМПАНІІ, АКРАМЯ НАС.
ТАМУ ДАЙ ЗНАЦЬ, КАЛІ ЗМОЖАШ ПАГУТАРЫЦЬ... ПРА ВОРАГА, ЦІ ЯШЧЭ ПРА ШТО-НЕБУДЗЬ.
ТЫ ЛІЧЫШ, ШТО БУДЗЕШ МАЎЧАЦЬ, АЛЕ НІХТО НЕ ВЫТРЫМЛІВАЕ ДОЎГА.
У РЭШЦЕ РЭШТ ТЫ ЎСЁ ПАВЕДАМІШ.
А ДА ГЭТАГА ЧАСУ ЦЕШСЯ АДПАЧЫНКАМ.


Сакавік, 31-е.
І праз шмат дзён.
Кароль Коль бачыў гэта?
Так. Ён проста праенчыў і сказаў, што збіраецца спаць.
VOTE for Prince Charming
Hero of the Battle of FABLETOWN
VOTE for King Cole
Hero of the Battle of FABLETOWN
Ён больш ня ў вобласці маіх ведаў, з таго часу, як зноў стаў дрэвам.
Але дрэва ўсё яшчэ магічнае, так жа, доктар Свіное Сэрца?
Значыць, **у выніку**, яго можна палатаць, праўда?
Зноў сумуеш, маці?
Мяркую, гэта меланхолія. Я думала пра Бу. Ты ўсё яшчэ думаеш пра Бу, тата?
Кожны дзень.
Я **цяжарная**, тата.
Што здарылася, спадарыня Чырвань?
Чаму вы плачаце, бос?
Проста так, праўда.
Я проста сумую па Велунду.
Бозлі?
Ммм?
Здаецца, што ў мяне адышлі воды.